# Міфы
# і ЛЕГЕНДЫ

*«Як? Чаму? Навошта? Гэтыя пытанні ты не раз задаваў не толькі бацькам, настаўнікам, а і самому сабе. Бо кожны, хто прыйшоў на гэтую зямлю, хоча ведаць — дзеля чаго? Намагаецца зразумець сэнс жыцця і сэнс быцця. У гэтым пошуку сябе і сваіх каранёў важнае значэнне мае вяртанне да духоўнасці, да веры, да нашай хрысціянскай веры, якую шанавалі і абаранялі цягам больш за тысячагоддзе насельнікі зямлі беларускай. З гэтай верай ствараюць свой заўтрашні дзень і сённяшнія беларусы. Але ж наш гістарычны шлях увабраў і тое, што было даўней — яшчэ да хрысціянства. Шмат стагоддзяў існавала язычніцтва, людзі шукалі магчымасць гарманічна жыць з прыродай і ў самой прыродзе. Пакланяліся сонцу, вадзе, зямлі, лесу, небу — усяму таму, ад чаго залежала іхняе жыццё, праца земляроба, што магло зрабіць чалавека багатым і шчаслівым. Сёння шмат з таго даўняга стала міфамі, легендамі, захоўваецца ў якасці народных звычаяў і свят...»*

*А. Бутэвіч*

**У міфах беларусаў шмат персанажаў. А ёсць шмат такіх, якіх няма ў міфах суседніх народаў: Зюзя, Баламуцень, Пячурнік, Зазоўка...**
**Сонца, зоркі, дрэвы, рэкі, жывёліны, расліны былі для нашых продкаў адушаўлёнымі істотамі.**

**Яны лічылі, што міфалагічнымі персанажамі населены лясы, палі, рэкі, балоты. Жывуць ў дамах, лазнях, хлявах і іншых пабудовах.**

**Хто ж быў галоўнымі багамі беларусаў? Вышэйшым бажаством беларусы лічылі Белбога, якога яшчэ называлі Бялун, або Бог неба. Ён меў трох сыноў: Перуна, Зюзю і Чарнабога.**

## БЕЛБОГ



Белбог зрабіў сабе Неба, а людзям — Зямлю і ўсё, што на ёй. Ён жа гаспадар Выраю. Гэта стары з доўгай белай барадою, ў белым адзенні і з кіем у руках. Белбог, ці Бялун, паказваецца толькі ўдзень, пры сонечным святле, і калі сустрэне ў лесе падарожніка, які заблудзіў, — пакажа яму правільную дарогу. Таму існуе і прымаўка: «Без Белуна цёмна ў лесе». У час жніва ён дапамагае жнеям.

У час жніва ён любіць паяўляцца на нівах і нават дапамагае жнеям. Любіць Бялун і пажартаваць, але заўсёды па-дабраму, і робіць багатыя падарункі. Ён

можа раптоўна з'явіцца ў жыце з вялікім мехам на носе. Высачыўшы добрага работніка ці работніцу, падзаве да сябе рукою і просіць уцерці яму нос.

Як толькі чалавек дакранецца да носа, з меха рангам пасыплецца золата і Бог знікне. Пра такога шчасліўца беларусы кажуць, што ён пасябраваў з Белуном. Белбог мае сына, які завецца Перуном

## ПЯРУН



Пярун — сын Белбога. Бог грому і вайны — у яго верылі ваяўнічыя славянскія плямёны. Тым, да каго Пярун ставіўся добразычліва, ён дапамагаў у баі. А сам перамог свайго злога брата Чарнабога.

Пярун — істота высокага росту, з чорнымі валасамі і залатой барадой. Ён трымае ў руках два вялікія камяні ад жорнаў, б'е імі адзін аб адзін — магчыма, для таго, каб выклікаць гром. Калі ён разгневаецца, можа параніць і забіць кожнага, хто асмеліцца зняважыць яго.

Служаць Перуну Духі-памагатыя — Гарцукі. У вольны час яны жывуць у вялікіх гарах. У час усходу і захаду сонца гуляюць па гарах. У поўдзень Гарцукі стралою носяцца на конях па палях і лясах. Ноччу, калі наступае час Чарнабога і яго памагатых, Гарцукі ў выглядзе розных драпежных птушак лятаюць у паветры, выконваючы даручэнні Перуна.

Памагатыя Перуна — магутныя Духі. Гарцукі здольныя ўтвараць вятры, буры, віхуры.

## ЖЫЖАЛЬ



Да Падземным агнём распараджаецца Бог Жыжаль, якога беларусы завуць яшчэ Жыж. Жыжаль толькі тое і робіць, што расхаджвае пад зямлёю і выпускае з сябе агонь. Калі ён ходзіць паціху, то агонь невялікі і саграваепе зямлю. Калі ж хутка, то выпраменьвае вялікі агонь, і частка полымя прарываецца на паверхню зямлі. Ад гэтага загараюцца лясы, балоты, лугі. Пажары выпальваюць сенажаці, хлеб на палях. Зямля ад перагрэву высушваецца, ад чаго агароды і палі робяцца бясплоднымі.

# Зюзя



Зюзя — жахлівы бог зімы. Паходзіць ад дзеяслова зюзець — мерзнуць, калець ад марозу. Гэта стары з доўгай сівой барадой. Ён ходзіць, апрануты ў белы доўгі кажух, босы і без шапкі, трымаючы ў руцэ жалезны посах або жазло. Разгневаны, ён стукае па ствалах дрэў сваім посахам, збіваючы снег і лёд, прымушае зіму накрыць халоднай посцілкай зямлю.

Каб не злаваць «халоднага» бога, людзі стараліся задобрыць яго. Асабліва любіў Зюзя куццю. Цёмнымі марознымі калряднымі начамі прыходзіў у вёску, зазіраў праз шыбы ў хату, шукаў на сталах свой любімы наедак. Яму і дагэтуль пакідаюць на стале трошкі куцці. Пры гэтым прыгаворваюць: «Зюзя на двары — куцця на стале». Часам кідаюць першую лыжку каляднай кашы за акно і клічуць ягонага служку: «Хадзі, мароз, куццю есці». Падсілкаваўшыся, ў падзяку за чалавечую шчодрасць пакідаў на ваконным шкле прыгожыя ўзоры, вымалёўваў розныя зімовыя кветкі.

# Кляскун

Бог месяца Кляскун — прыгожы, вясёлы і разумны юнак, але вялікі жартаўнік. Ён любіць забаўляцца, палохаючы людзей, асабліва ўначы. У таго, хто едзе ці ідзе ноччу, ёсць звычайна свае прыкметы, каб не заблукаць у цемры. Кляскун пацяшаецца тым, што перастаўляе гэтыя знакі з аднаго месца на другое. Дзе на перакрыжаванні дарог стаяў магутны дуб, там праезджы раптам бачыць невялікі куст. Вось тут была палянка, бач — а ўжо невялікае возера і дарогі няма. Такімі жартамі ён збівае людзей з дарогі, прымушае блукаць, даводзіць да роспачы і тады рагоча, як шалёны. Часам Кляскун прыкідваецца добрым знаёмым падарожніка, заводзіць з ім размову і просіць трошкі падвезці. Чалавек згаджаецца. Толькі праедуць яны крыху разам, раптам сані ці калёсы пераварочваюцца ў раўчук, а спадарожнік знікае і толькі дзесьці ўдалечыні чуваць яго свіст і рогат. Здараецца і так, што праезджы чуе збоку енк, які разрывае душу, ці плач дзіцяці, ці бачыць перад сабою раку. Вопытны беларус ведае, што гэта азначае. Яго не разжаляць гэтыя стогны і плач, не спалохаецца ён і ракі: не прыпыняючыся і не зварочваючы ўбок, працягвае чалавек свой шлях. Гора

таму, хто паверыць і прыме за сапраўднае хітрыкі Кляскуна. Ён трапіць у такую багну, што толькі ўдзень, пры дапамозе людзей, вызваліцца з яе.



## ЧАРНАБОГ (ЧОРТ)

Гэта бог цемры, зла і смерці. Ён быў мужам Мараны, багіні смерці. Пра яго вядома мала, за выключэннем таго, што ён уступіў у барацьбу з богам Перуном, які перамог Чарнабога пры дапамозе магічнага молата, што падарыў яму бацька, Белбог —Бялун. Памяць аб ім захавалася ў народнай песні: «Быў на Русі Чорны бог».

**Пра ніжэйшых багоў у беларускай міфалогіі вядома няшмат. Гэта багі прыроды і стыхіі, багі-апекуны розных рамёстваў і прафесій.**

## ЛАДА



Бажаства, якое падтрымлівае лад на зямлі, парадак у сям'і. Багіня кахання, прыгажосці і ўрадлівасці. Лада — дачка марскога бога, Цара-Мора. Яна белая з твару, з доўгай залатой касой. Пад яго апекай ўсё ішло парадкам, ладам, кругам: пасля дня наступала ноч, пасля зімы — лета, і ўсё ў сваім парадку, ўсё ў ладзе.

Год складаў круг Лада, і ім было тры Ладавы святкі і адно дзядовае свята. Святы гэтыя прыпадалі якраз на пераломы года: вясну, лета, восень і зіму. Ў яе ёсць дачка Ляля (Леля).

## ЛЯЛЯ (ЛЕЛЯ)



Багіня вясны, маладзенькая, прыгожая маладзіца, апранутая ў доўгую белую вопратку. Дзяўчаты на Ляльнік (у нядзелю ў канцы красавіка) апраналі самую прыгожую дзяўчыну ў доўгі белы плашч і плялі вянок з кветак. Яна сядзела на белым кані, а дзяўчаты вакол хадзілі карагодам і спявалі ў яе гонар песню. «Прыгожая, як Ляля», — так адзначалі прыгажосць зямной маладзіцы.

# МАКАШ



Макаш — Багіня часу і лёсу людзей, апякунка жанчын і жаночых рамёстваў: ткацтва, прадзення, вышывання. Багіня і сама з'яўляецца выдатнай майстрыхай. Макаш апякуецца над жанчынамі, але і жорстка іх карае за непавагу да сябе.

Неяк у пятніцу сядзела вечарам жанчына каля акна і прала. Чуе — нехта пад акном стукае. Глянула — баба старэнькая стаіць, зморшчаная, як сучок. Паглядзела тая баба на жанчыну сурова і пытаецца ў яе: — Чаму ты, маладзіца, так позна прадзеш ды ў гэты дзень? — Як жа мне не прасці, калі ў мяне дзеткі малыя, не пасобяць — самой трэба паспець.

— Ну, калі ты такая пільная, на табе сто верацён. Каб ты мне іх да раніцы ўсе напрала.

Як сказала тое баба, так і падзелася невядома куды, як скрозь зямлю праваліліся.

Спужалася жанчына, зразумела, што нешта тут няладна. Думала, думала што ёй рабіць, і прыдумала. Не стала руцнёў прасці, а ўзяла ды па адной нітачцы на кожнае верацяно наматала. Так усе сто верацён да раніцы і заматала.

На золку зноў старая прыходзіць і пытаецца:

— А што, маладзіца, ці пазапрала мне мае верацёны? Маладзіца паказала ёй верацёны. Тады і кажа ёй старая: — Разумная ты, маладзіца, што так зрабіць здагадалася. Не зрабі ты гэтага, ды вярні мне голыя верацёны, я б цябе саму, як голае верацяно, скруціла і ссушыла б; Я Макаш. Сёння мой дзень. Глядзі, не прадзі ў пятніцу больш.

# ЖЫТНЯЯ БАБА



ў старажытных славян была багіняй ўрадлівасці. Жытнюю бабу рабілі з вялікага снапа, перавязвалі яго ручніком, палівалі грамнічнай вадою і ставілі пад абразы на покуці. Жытняя баба дапамагае пры родах. Хто шануе Жытнюю бабу, той заўсёды мае добры ўраджай на ніве.

У беларускім фальклоры, акрамя імён багоў, сустракаюцца імёны ніжэйшых духаў — дэманаў і

фей. Шматлікія духі па-рознаму ставяцца да людзей: адны з іх прыхільныя да чалавека, другія — бясшкодныя, трэція — злыя. Вось некаторыя іх імёны: Чур, Спарышка, Хут, Пячурнік, Вох, Лазнік, Хіхітун....

## СПАРЫШКА, СПЕШКА

Спешка-Спарышка — дух жніва. Дае поспех і спор усякай рабоце. Калі хто, пачынаючы работу, папросіць яе, то яна пераляціць перад ім — і работа зробіцца хутка і лёгка, і хутка дзень мінецца і вечар набяжыць.



Калі няма спору ў працы, ды на душы ляжа важкі камень, то як згадаеш «Спарышка», дык зараз і палягчэе, бо пакажацца спор і ў рабоце, і ў хлебе.

## ЛАЗНіК

Лазнік — жыхар і гаспадар лазні. Жыве за печчу-каменкай ці пад палком... Гэта злы дух, які нагадвае Вадзяніка. Ён любіць парыцца і мыцца, яму пакідаюць дзеля гэтага венік і ваду. Мыецца пасля поўначы ці заходу сонца, а таму не любіць, каб хто-небудзь заставаўся да гэтага часу ў лазні. Калі ж хто застанецца, то Лазнік пачынае кідаць з печы камяні, імкнучыся забіць парушальніка.



## ВОХ



Вох — маленькі барадаты чалавечак, які жыве пад зямлёю. Любіць людзей і заўсёды гатовы прыйсці ім на дапамогу. Хто, бядуючы, ўздыхае: «Вох!», ён выйдзе з-пад зямлі і папытае: «Чаго патрабуеш?» Калі чалавек не спалохаецца і выкажа сваё жаданне, Вох яму тое і дасць. Вобраз Воха сустракаецца і ў чарадзейных казках («Аб Оху і залатой табакерцы»).

# ПЯЧУРНІК



Дамавы дух, які жыве ў падпеччу ці ў запечку. Сваім аблічам ён нагадвае ката, толькі ходзіць на задніх лапах, хоць чалавеку стараецца не паказвацца. Пячурнік апякуе той дом, дзе жыве.

Ён прадчувае бяду і непрыемнасці, што могуць адбыцца з гаспадарамі дома. Тады пачынае пасоўваць мэблю, скідваць і разбіваць посуд — папярэджваць гаспадароў пра небяспеку. Але бывае, што Пячурнік і жартуе: зносіць патрэбную рэч са звычнага месца ў іншае ці хавае яе.

# ХІХІТУН



Хіхітун — нячысцік, які знаходзіцца ў чалавека за спінай. Калі з чалавекам ці з блізкімі яму людзьмі можа здарыцца нешта нядобрае, Хіхітун пачынае радавацца гэтаму, смеючыся тоненька і часта: «Хі-хі, хі-хі, хі-хі,...». Рэзка абярнуўшыся назад у гэты момант, можна ўбачыць маленькае стварэнне, якое знешне нечым нагадвае малпачку, а на макаўцы ў яго невялічкія рожкі.

Шмат гадоў мінула, шмат міфаў ужо страчна незваротна. Я лічу, што міфы, якія яшчэ захаваліся, — гэта неацэнны скарб, які неабходна зберагчы. Варта вывучаць гісторыю свайго народа і добра ведаць яе.

# ЯРЫЛА

Ярыла — бог урадлівасці, кахання і апякун дзікай жывёлы. Гэта малады прыгожы юнак. Ён раз'язджае па зямлі на белым кані і ў белым плашчы. На галаве ў яго вянок з веснавых кветак, у руках каласы, ногі босыя. Адным з веснавых дзён Ярыла з дазволу Багоў адмыкае нябесную браму і на белым кані па сонечным промні з'язджае на зямлю, каб адчыніць яе. Ярыла едзе па засеяных нівах. Яго сустракаюць усе жыхары паселішчаў. У людзей

на галовах вянкі з кветак. Старыя кіруюць карагодам, які спявае песні ў гонар Бога.



З Ярылавага дня пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты ж дзень упершыню выганяюць скаціну ў поле. Ярыла сам ездзіць на белым кані і ахоўвае жывёлу.

Часам можна бачыць, што паблізу статка бегае воўк, але не чапае скаціны, хоць побач няма пастуха. Гэта нябачны Ярыла ездзіць на ваўку і ахоўвае статак.

Беларусы ўшаноўваюць Ярылу на працягу красавіка. Шанаванне суправаджаецца карагодамі, песням! ў яго гонар, баляваннямі.

Да Ярылавага дня нельга вадзіць коней на начлег, бо ў ваўкоў няма яшчэ гаспадара — Ярылы, і яны псуюць шмат коней. У адпаведную ноч Ярыла збірае звяроў у адно месца і размяркоўвае, куды каторaму ісці на лета жыць. Ён замыкае пашчы ваўкам, і тыя перастаюць нападаць на скаціну ці значна змяншаюць колькасць сваіх знішчальных набегаў. Ярыла назірае, каб яны не чапалі скаціну, якая ім не прызначаная. Калі Ярыла хоча пакараць людзей ды папсаваць хатнюю жывёлу, ён сам насылае ваўкоў.

Позняй восенню Ярыла адмыкае пашчы ваўкам. З гэтага дня крыважэрныя ваўкі пачынаюць хадзіць зграямі і нападаць на скаціну.

Памагаюць Ярылу наглядаць за звярамі, што жывуць у лесе, Лесавікі са сваім Гаспадаром.

**Калі ты, дарагі чытач, жадаеш падрабязней даведацца пра характары, звычкі і норавы незвычайных міфічных герояў беларускіх легенд, паданняў і казак, запрашаем наведацца ў дзяцячую бібліятэку-філіял і пачытаць наступную літаратуру:**




**Бутэвіч А. І. Перуновага племені дзеці : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Анатоль Бутэвіч; ілюстрацыі П. Ю. Татарнікава. — Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2008. — 27, [4] с. — (Сем цудаў Беларусі).**

Даўнія міфічныя героі нібыта клічуць зазірнуць за намітку гісторыі, за яе небакрай, каб даведацца: а што ж было там і тады, дзе і калі не было нас? Бо веданне сваёй гісторыі — гэта добры шанц не знікнуць у невядомасці, не растварыцца ў часам багацейшай і больш даследаванай гісторыі іншых народаў. Гэта выдатная магчымасць адчуць повязь часу, еднасць лёсу, адказнасць за тое, што было да нас, і за тое, што застанецца пасля нас.




**Бяздоннае багацце : Легенды, паданні, сказы / складальнік А. І. Гурскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 255с.**

У зборнік увайшлі беларускія народныя легенды, паданні вусныя сказы, у якіх адлюстроўваюцца нацыянальныя рысы жыцця народа, выяўляецца яго светапогляд. Творы ўзяты з рукапісных архіваў, а таксама з фальклорна-этнаграфічных зборнікаў Е. Раманава, П. Шэйна, А. Сержпутоўскага, М. Дабравольскага, М. Федароўскага, з літаратурных крыніц і запісаў самога складальніка.




**Востраў русалак : легенды, паданні / укладальнік У. К. Казько ; мастак Т. П. Беразенская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 135 с. : іл. — (Беларускі фальклор).**

У гэтым зборніку уключаны малавядомыя шырокаму чытачу творы, дзе падаюцца старажытныя міфалагічныя ўяўленні пра паходжанне Сусвету, Зямлі, чалавека, раслін, жывел, дзе чалавек рабіў спробы разабрацца ў прычынах розных захворванняў, выказваў адносіны простых людзей да Бога, святых і іх антыподаў – чарцей, ведзьмакоў.




**Вужовы кароль : Беларускія легенды і паданні : для малодшага школьнага ўзросту/ пераказ і ўкладанне У. І. Ягоўдзіка ; мастак М. Д. Рыжы. — Мінск : Юнацтва, 1996. — 140 с. : іл.**

У кнігу ўключаны лепшыя ўзоры беларускіх народных легенд і паданняў. Яны расказваюць, як ствараліся свет і яго насельнікі, а таксама, як на Беларусі ўзніклі рэкі і азёры, адкуль пайшлі іх назвы, назвы вёсак і гарадоў. Дапытлівага чытача чакаюць сустрэчы з дамавікамі і русалкамі, ваўкалакамі і начніцамі




**Жывая крыніца : Вусная народная творчасць : для сярэдняга школьнага ўзросту / укладльнік М. А. Зелянкова ; мастак Г. В. Шапялевіч. — Мінск : Юнацтва, 1991. — 271 с. : іл. — (Школьная бібліятэка).**

У кнігу ўвайшлі легенды і паданні, беларускія народныя казкі (казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя), песні, а таксама прыказкі, прымаўкі, загадкі.




**Жыццядайныя крыніцы : Легенды і паданні : для сярэдняга школьнага ўзросту / укладанне А. М. Ненадаўца ; мастак П. Славук. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 159с. : іл**

Легенды і паданні пра паходжанне рэк Беларусі, сабраныя і апрацаваныя А. М. Ненадаўцам, адлюстроўваюць многія падзеі, найбольш характэрныя рысы і асаблівасці мінулага часу. Дзякуючы ім мы зараз маем даволі дакладныя звесткі аб духоўным жыцці нашых прашчураў, аб іх памкненнях, бо менавіта ў вусна-паэтычных творах адбіліся самыя дробныя зрухі ў самасвядомасці народа, яго спадзяванні, вера ў тое, што ўсе ліхое міне і чалавек дачакаецца такога жыцця, якое ён заслужыў свабй самаадданай працай, цярпеннем і шматлікімі выпрабаваннямі.




**З крыніц адвечнай прыгажосці : Украінскія і беларускія народныя. легенды, паданні і казкі : для малодшага школьнага ўзросту / укладальнікі Б. І. Чайкоўскі, М. А. Зелянкова ; перавод з украінскай мовы Т. В. Кабржыцкай ; мастак Ю. Ц. Цярэшчанка. — Мінск : Юнацтва, 1999 г. — 285 с. : іл.**

У зборнік увайшлі ўкраінскія і беларускія народныя легенды, паданні і казкі, у якіх адлюстроўваюцца гіс тарычныя шляхі братніх народаў, іх мудрасць, працавітасць, мужнасць, свабодалюбства.




**Легенды і паданні / складальнікі : М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. — Мінск : Беларуская навука, 2005. — 552 с.**

У выданні сабраны легенды і паданні. У іх пададзены старажытныя міфалагічныя ўяўленні пра паходжанне сусвету, зямлі, чалавека, жывёл і раслін, легенды сацыяльнага зместу, а таксама адносіны да бога і святых; паданні апавядаюць пра гістарычныя падзеі і гістарычных асоб, пра паходжанне беларускіх гарадоў, вёсак, урочышчаў і іх назваў. Разлічана на ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй культуры і творчасцю свайго народа.




**Магілёўшчына : Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў / складанне А. М. Ненадаўца. — Мінск : Беларусь, 2002. — 416 с. : іл. — (Мой родны кут).**

Кніга дае тапаніміку 118 населеных пунктаў Магілёўскай вобласці паводле легендаў і паданняў. Гады ляцяць, мінаюць стагоддзі, а памяць застаецца. Толькі ёй у многіх выпадках мы дзякуем за тое, што даносіць да нас, сённяшніх жыхароў, водгласы далёкай мінуўшчыны. Адрасавана тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, духоўнай культурай беларускага народа.




**Млын на сямі колах : Беларускія народныя легенды і паданні : для сярэдняга школьнага ўзросту. — Мінск : Юнацтва, 1998. — 334с.**

У кнізе змешчаны легенды і паданні, сабраныя па ўсёй Беларусі, якія апавядаюць пра паходжанне назваў вёсак, мястэчак, гарадоў, асобных мясцін.




**Легенды і казкі польскіх і беларускіх паэтаў : для малодшага школьнага ўзросту / перавод з польскай мовы А. Лойкі, В. Зуёнка ; мастак У. Гладкевіч. — Мінск : Юнацтва, 1992. — 126 с. : іл.**

Зборнік складаецца з дзвюх частак. У першую частку, падрыхтаваную польскімі калегамі, ўвайшлі творы Ч. Янчарскага, Г. Свіршчыньскай і У. Бранеўскага. Яны ўпершыню выдаюцца на беларускай мове.

У беларускі раздзел увайшлі паэмы і казкі Я. Купалы, У. Дубоўкі, М. Танка, А. Грачанікава і В. Лукшы.




**Чароўны свет : з беларускіх міфаў, паданняў і казак / рэдкалегія : Т. У. Бялова і інш. ; мастак В. П. Слаук. — 2-е выданне. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. — 216 с. : іл.**

У кнізе прадстаўлены найбольш папулярныя казачныя персанажы і вобразы беларускай міфалогіі, што захаваліся ў духоўнай спадчыне беларусаў да нашых дзён. Выданне багата ілюстравана. Разлічана на шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца культурай беларускага народа.